## Наш край у 1917–1945 гг.

**1.** Работа в мини-группах. Используя картосхемы, материалы уч1. Праца ў міні-групах. Выкарыстоўваючы картасхемы, матэрыялы вучэбнага дапаможніка і гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» вашага раёна, вызначце:

А. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіў ваш населены пункт у 1917–1945 гг.? Як змяняўся яго статус?

Б. Якія прамысловыя або сельскагаспадарчыя прадпрыемствы былі пабудаваныя ў вашай мясцовасці ў 1921–1941 гг.?

В. Якія гістарычныя падзеі 1917–1945 гг. закрынулі жыхароў вашага населенага пункта, раёна? Якім чынам?

Прэзентуйце вынікі сваёй працы класу, параўнайце з вынікамі іншых міні-груп. Падрыхтуйце агульную прэзентацыю «Мая малая радзіма ў 1917–1945 гг.». Параўнайце яе з прэзентацыяй «Мая малая радзіма ў XIX — пачатку XX ст.», зрабіце вывад наконт развіцця сваёй мясцовасці ў першай палове XX ст.

**2.** Экскурсія па родным краі. З дапамогай матэрыялаў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць», карты спаленых вёсак на Публічнай кадастравай карце (https://map.nca.by), электроннай базы даных «Беларускія вёскі, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (http://db.narb.by), дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, якія месцы знішчэння мірных грамадзян у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама мемарыялы і месцы памяці ёсць у вашай мясцовасці. Складзіце план экскурсіі па вуліцах населенага пункта «Мой горад (мястэчка, вёска) у гады Вялікай Айчыннай вайны».

**3.** Славутыя землякі. З дапамогай матэрыялаў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» і дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, жыццё і / або дзейнасць якіх славутых людзей першай паловы XX ст. звязаная з вашай мясцовасцю. Знайдзіце пры магчымасці іх успаміны або творы пра ваш родны край. Прэзентуйце вынікі вашага даследавання ў выглядзе артыкула ў СМІ або поста ў сацыяльнай сетцы.

4. Мая сям'я. Даведайцеся пра гісторыю сваёй сям'і ў 1917–1945 гг.: імёны прабабуль і прадзядуль, дзе жылі, чым займаліся, які ўдзел бралі ў гістарычных падзеях. Для пошуку звестак пра сваіх продкаў выкарыстайце пошукавыя сайты, напрыклад Партызаны Беларусі (https://partizany.by), АБД Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь (https://memory.mil.by).

Падрыхтуйце аповед пра лёс сваёй сям'і ў 1917–1945 гг. Як змяніліся заняткі, месца жыхарства вашых продкаў у параўнанні з перыядам XIX — пачатку XX ст.?